БССР 60 КПБ

# У БАРАЦЬБЕ З РАЗРУХАЙ

**«Расія з вайны выйшла ў такім становішчы, — гаварыў У. І. Ленін, — што яе становішча больш за ўсё падобна на становішча чалавека, якога збілі да паўсмерці...». Савецкая краіна будзе пабіта, указваў Ільіч, калі партыя не даб'ецца аднаўлення народнай гаспадаркі, далейшага ўмацавання саюза рабочых і сялян.**

**Такой была абстаноўка, такой была галоўная задача маладой Краіны Саветаў, якая ўступала ў новы мірны этап свайго развіцця. Гэтаму часу — 1920—1925 гадам — мы прысвячаем сёння чарговую газетную паласу «Старонкі летапісу роднай рэспублікі».**

ЧЫМ жылі ў тыя гады Беларусь, наша Гомельшчына? Тым жа, чым і ўся краіна. Гэты час увайшоў у гісторыю гераізмам Чырвонай Арміі ў апошніх баях з замежнай інтэрвенцыяй, VIII з'ездам Саветаў, дзе быў прыняты ленінскі план ГОЭЛРО, X з'ездам РКП(б) (8—16 сакавіка 1921 года), які прыняў ленінскую рэзалюцыю аб адзінстве партыі, ленінскую прапанову аб пераходзе ад «ваеннага камунізму» да новай эканамічнай палітыкі; нябачаным рэвалюцыйным энтузіязмам мас у будаўніцтве новага жыцця, вынікі якога У. І. Ленін падвёў на XI з'ездзе РКП(б) — у сакавіку—красавіку 1922 года. А завяршыўся гэты год падзеяй выключнай важнасці — 30 снежня I Усесаюзны з'езд Саветаў прыняў Дэкларацыю аб утварэнні СССР і аб'яднанні ў ім брацкіх рэспублік на аснове добраахвотнасці і раўнапраўя.

Велізарную работу вялі ў гэтыя гады і камуністы Беларусі — баявы атрад ленінскай партыі, усе працоўныя рэспублікі. 25 лютага — 2 сакавіка 1921 года ў Мінску адбыўся IV з'езд КП(б)Б, які ў парадку падрыхтоўкі да X з'езда абмеркаваў актуальныя пытанні жыцця рэспублікі. 15—20 кастрычніка 1921 года працаваў V з'езд камуністаў Беларусі. Ён падвёў вынікі дзейнасці па растлумачэнню і ажыццяўленню рашэнняў X з'езда партыі. У рэзалюцыі гэтага з'езда камуністы Беларусі запісалі: «Новая эканамічная палітыка ёсць адзіна правільны шлях, які ў даных умовах правільна вырашае самое пытанне існавання Савецкай улады».

15—18 сакавіка 1922 года — дні работы VI з'езда КП(б)Б, які падвёў вынікі першага года НЭПа, выставіў галоўную задачу — павышэнне тэмпаў аднаўлення народнай гаспадаркі, згуртаванне партыйных радоў. 18 снежня гэтага ж года адбыўся IV з'езд Саветаў БССР, які прыняў дэкларацыю аб неабходнасці ўтварэння СССР і паслаў дэлегацыю на X Усерасійскі з'езд Саветаў на чале з старшынёй ЦВК і СНК БССР А. Г. Чарвяковым.

Поспехі працоўных былі азмрочаны хваробай Ільіча. У снежні 1922 — сакавіку 1923 года ён прадыктаваў свае апошнія артыкулы, у якіх ленінскі план будаўніцтва сацыялізму атрымаў далейшае развіццё. Вялікі кормчы рэвалюцыі быў душой усіх спраў Краіны Саветаў, і цяжкім болем адгукнулася ў сэрцы народа смерць настаўніка і правадыра. У тыя дні нарадзіўся лозунг: «Ленін памёр, але справа яго жыве». Ён згуртоўваў людзей вакол партыі, дапамагаў ажыццяўляць запаветы Ільіча.

20—26 сакавіка 1923 года працаваў VII з'езд Кампартыі Беларусі. Яго рашэнне: больш увагі ўдзяляць уздыму цяжкай прамысловасці. 13—16 сакавіка 1924 года адбыўся VI Надзвычайны з'езд Саветаў Беларусі, дэлегатаў якога ад імя ЦК РКП(б) і ЦВК СССР вітаў М. І. Калінін. 12—14 мая 1924 года адбыўся VIII з'езд КП(б)Б, у рэзалюцыі якога адзначаліся вялікія поспехі ў аднаўленні прамысловасці і сельскай гаспадаркі Беларусі. 8 снежня 1925 года адкрыўся IX з'езд камуністаў Беларусі. Ён падвёў вынікі аднаўленчага перыяду, намеціў чарговыя задачы ў камуністычным будаўніцтве, выказаўся за ажыццяўленне палітыкі сацыялістычнай індустрыялізацыі Савецкай краіны, у тым ліку і Беларускай Рэспублікі.

Цяжка нават проста пералічыць усе гістарычныя падзеі, якія характэрны для тых гадоў. Назавем яшчэ дзве: у красавіку 1925 года працавала XIV канферэнцыя РКП(б). Яна абмеркавала пытанне аб паляпшэнні работы ў вёсцы, асудзіла «тэорыю перманентнай рэвалюцыі» трацкістаў, якая адмаўляла магчымасць перамогі сацыялізму ў адной, асобна ўзятай краіне. А 18—31 снежня гэтага года адбыўся XIV з'езд ВКП(б) — з'езд індустрыялізацыі краіны.

Дні, месяцы шасці гадоў... Яны напоўнены працай, барацьбой, вучобай савецкіх людзей, першымі поспехамі ў будаўніцтве сацыялізму, аб чым гавораць дакументы, матэрыялы гэтай старонкі.

## ВІТАЕМ СТВАРЭННЕ СССР

Заслухаўшы даклад аб X з'ездзе Саветаў, валасная канферэнцыя адзначае поспехі нашай рэспублікі на знешнім і ўнутраным франтах, дасягнутыя дзякуючы цеснай і непарыўнай спайцы рабочых і сялян і актыўнай падтрымцы імі рабоча-сялянскай улады. Мы вітаем стварэнне Саюза Савецкіх Сацыялістчных Рэспублік і заяўляем, што ў далейшым гатовы па першаму клічу на абарону і падтрымку рабоча-сялянскай улады.

**Пастанова Холмецкай валасной беспартыйнай сялянскай канферэнцыі Рэчыцкага павету ад 20 студзеня 1923 года.**

* * *

Заслухаўшы даклад аб X Усерасійскім з'ездзе, валасная беспартыйная канферэнцыя рабочых і сялян вітае стварэнне Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік і заяўляе аб сваёй гатоўнасці па першаму заклiку абараняць і падтрымліваць рабоча-сялянскую ўладу.

**Пастанова Ровенска-Слабадскай валасной беспартыйнай сялянскай канферэнцыі Рэчыцкага павету ад 25 студзеня 1923 года.**



**На здымку: першамайскі суботнік у г. Жлобіне ў 1920 г.**

## ГАРАЦЬ ЛЯМПАЧКІ ІЛЬІЧА

Заслухаўшы даклад-справаздачу аб заканчэнні пабудовы 1-й часткі Гомельскай гарадской электрычнай станцыі, гарадскі Савет з гонарам канстатуе, што за параўнальна невялікі прамежак часу з моманту закладкі поўнасцю выканана ўзятае ім абавязацельства перад працоўнымі гор. Гомеля па збудаванню станцыі і разам з тым атрымана магчымасць даць электрычнае святло звыш чым 300 рабочым кватэрам.

Зыходзячы з вышэй выкладзенага, Гомельскі гарадскі Савет рабочых і чырвонаармейскіх дэпутатаў 7-га склікання разам з прафесіянальнымі арганізацыямі і прадстаўнікамі Чырвонай Арміі пастанаўляе:

1. Адобрыць праведзеную работу па збудаванню 1-й чаргі электрастанцыі.

2. Выказаць таварыскую ўдзячнасць усім рабочым, служачым і кіраўнікам будаўніцтва электрастанцыі.

**Рэзалюцыя аб'яднанага пасяджэння Гомельскага гарсавета разам з праўленнямі прафсаюзаў, фабзаўкомаў аб заканчэнні будаўніцтва 1-й чаргі Гомельскай гарадской электрастанцыі. 29 красавіка 1923 г.**

## КАБ ХУТЧЭЙ ВЫЙСЦІ З ЦЕМРЫ

Насовіцкая валасная сельскагаспадарчая канферэнцыя знаходзіць, што прынятае шэфства над Насовіцкай воласцю рабочымі навабеліцкіх лесазаводаў зблізіць рабочых і сялян моцным саюзам. А таму пастанавілі: вітаць гэтае шэфства і прасіць рабочых прысылаць сваіх агітатараў для правядзення сходаў і мітынгаў па сяленнях, каб хутчэй выйсці з цемры і невуцтва.

**Рэзалюцыя Насовіцкай валасной сельскагаспадарчай канферэнцыі Гомельскага павету ад 13 красавіка 1923 года.**

## НЕАБХОДНЫЯ, ЖАДАНЫЯ, СВОЕЧАСОВЫЯ

Заслухаўшы даклад па бягучаму моманту тав. Дзядкова, Насовіцкі валасны з'езд знаходзіць, што Савецкая ўлада, дзякуючы доблеснай Чырвонай Арміі, закончыла вайну з бандытамі розных назваў і груп, падтрымліваемымі меншавікамі і эсэрамі, перайшла на мірнае будаўніцтва.

Валз'езд упэўнен, што да старога вяртання няма, што ўлады для рабочых і сялян лепш Савецкай быць не можа...

**Рэзалюцыя VII Насовіцкага валаснога з'езда Саветаў Гомельскага павету аб актыўнай падтрымцы новай эканамічнай палітыкі. 10 мая 1921 года.**

## НЕ ПАКЛАДАЮЧЫ РУК

Заслухаўшы даклад прадстаўніка павятовага гарвыканкома тав. Парошына аб бягучым моманце, харчпадатку і зямельнай палітыцы, з'езд дэлегатаў Маркавіцкай воласці, ведаючы, што пераход да мірнага будаўніцтва дасягнут намаганнямі і ахвярамі Чырвонай Арміі і працаўнікоў тыла, выказвае поўнае давер'е Савецкай уладзе і заклікае сваіх выбаршчыкаў не пакладаючы рук працаваць над аднаўленнем сваёй гаспадаркі, так як толькі перамога над разрухай, выклікaнай вайной, выведзе сялян і рабочых у светлае, свабоднае і шчаслівае жыццё.

**Рэзалюцыя Маркавіцкага валаснога з'езда Саветаў Гомельскага павету ад 9 мая 1921 года.**

## АКАЗВАЦЬ УЗМОЦНЕНАЕ САДЗЕЯННЕ

Лічачы калектыўныя гаспадаркі адной з дасканалых форм вядзення сельскай гаспадаркі, якая мае ў той жа час і выхаваўчы ўплыў на працоўныя масы, неабходна аказваць узмоцненае садзеянне ўжо арганізаваным калектывам і заахвочваць стварэнне новых.

**З рэзалюцыі V з'езда КП(б)Б (кастрычнік 1921 г.) Часопіс «Известия ЦК КП(б)Б» № 13, лістапад 1921 г.**

## АДЗІНА ПРАВІЛЬНЫ ШЛЯХ

Новая эканамічная палітыка ёсць адзіна правільны шлях, які ў даных умовах правільна вырашае самое пытанне існавання Савецкай улады.

**З рэзалюцыі V з'езда КП(б)Б «Аб знешнім і ўнутраным становішчы». Кастрычнік 1921 года.**

## ЭКАНАМІЧНАЯ ПЕРАВАГА

Эканамічную перавагу сваю над сялянскай гаспадаркай калектывісты ўжо выявілі: у той час як індывідуальныя гаспадаркі давалі ад 25 да 30 пудоў жыта з дзесяціны, побач знаходзіўшаяся калектыўная давала 65—70 пудоў. Нездарма мы маем павелічэнне колькасці калектыўных гаспадарак з 8 у 1923 годзе да 19 у 1924 годзе пры наяўнасці масы заявак ад сялян аб прыёме ў калектывы.

**З паведамлення ў ЦК КП(б) Беларусі Мазырскага акружкома партыі ў студзені 1925 года.**

## РАБОЧЫХ— НА КУРОРТ

Губздраў атрымаў нарад на 140 месц для адпраўкі хворых рабочых на поўдзень (Адэса, Крым, Каўказ). Адпраўка курортных хворых адбудзецца 14 мая. Месцы размяркоўваюцца губпрафсаветам праз саюзы і ўпрафбюро.

**Газета «Полесская правда» № 279. 3 мая 1921 года.**

## КРЫМ — НАРОДНАЯ ЗДРАЎНІЦА

Група рабочых, накіраваных губздравам на курортнае лячэнне ў Крым, шле сваю сардэчную ўдзячнасць губпрафсавету, губздраву і эвакапункту за праяўленыя клопаты.

Крым, у які да кастрычніка 1917 года штогод сцякаліся з усіх канцоў Расіі дармаеды: растлусцеўшыя банкіры, купцы, памешчыкі і генералы, робіцца здраўніцай рабочых. У цудоўных дачах Крыма, дзе раней весяліліся буржуі, на беразе мора пралетарыі, якія згубілі ў бесперапыннай працы сваё здароўе, адновяць свае сілы, каб з падзесяцяронай энергіяй будаваць царства працы, свабоды і шчасця. Прывітанне гомельскім рабочым, прывітанне губпрафсавету і губздраву!

**Па даручэнню групы Д. Брагінскі.**

**Газета «Полесская правда» № 291. 20 мая 1921 года.**

## ШЭФСТВА НАД ФЛОТАМ

У сувязі з прымацаваннем да нашай губарганізацыі ў якасці падшэфнай ваенчасці карабля «Марат», для азнаямлення і плана канкрэтных мерапрыемстваў сувязі з падшэфнай часцю, камандзіраван член губкома т. Жэбран.

Бюро губкамала таксама пастанавіла прыняць усе меры для ўстанаўлення цеснай сувязі з «Маратам». Акрамя гэтага, прадугледжваецца стварыць спецыяльны грашовы фонд.

**Газета «Набат моладзі» 29 чэрвеня 1924 года.**

## ДАПАМОГА АНГЛІЙСКІХ РАБОЧЫХ

Арганізаваны англійскімі рабочымі «Савет дзеяння» намеціў вялікую дэманстрацыю ў карысць заключэння міру з Савецкай Расіяй і ўзнаўлення гандлёвых зносін.

**«РОСТА» — насценная газета Гомельскага абласнога бюро РОСТА ад 9 кастрычніка 1920 года № 115.**

**Матэрыялы гэтай старонкі падрыхтаваны да друку дацэнтам кафедры гісторыі КПСС Э. ЭНЦІНЫМ і дырэктарам Дзяржаўнага архіва Гомельскай вобласці А. ЗЕЛЯНКОВЫМ.**

